## НАРОДНЫЯ КУЛЬТУРНЫЯ ТРАДЫЦЫІ Ў СУЧАСНЫМ САЛОМАПЛЯЦЕННІ БЕЛАРУСІ

**А.В. Шаціло, БДУКМ (Мінск)**

У працэсе стварэння сучаснай нацыянальнай ідэалогіі вывучэнне беларускага народнага мастацтва з'яўляецца актуальным, таму што яно ўплывае на фарміраванне светапогляду. Паколькі ўсе значныя культурныя канцэпцыі фіксуюцца ў прадметных формах і візуальных вобразах, мастацтва ўвасабляе семантычна значную філасофска-культурную канцэпцыю пэўнай эпохі. Народнае мастацтва можна разглядаць як сродак адлюстравання нацыянальных культурных цэннасцяў. Таму яно адыгрывае важную ролю ў фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў ва ўмовах глабалізацыі.

Традыцыі пляцення бытавых і абрадавых рэчаў маюць свае карані ў глыбокай старажытнасці, захаваліся да XXIст. і працягваюць развівацца і ўзбагачацца новымі формамі і прыемамі, часам далека адыходзячы ад сваіх прататыпаў. У сучасным саломапляценні сустракаецца вялікая колькасць разнастайных твораў, дзе не заўсёды вылучаюцца прамыя аналогіі з традыцыйнай абрадавай пластыкай, але паміжволі яны нясуць у сабе аграрна-салярную сімволіку, захоўваюць стылістычную, вобразную і знакава-сімвалічную традыцыю. Зараз творы народнага мастацтва і ў тым ліку мастацтва саломапляцення, якія абапіраюцца на матывы беларускага фальклору і старажытнай міфалогіі, адарваныя ад першаснасці свайго існавання – у абрадзе, нясуць у сабе іншую сэнсавую і эстэтычную нагрузку. Яны набываюць новую інтэрпрытацыю філасофскага асмыслення мастаком народных традыцый, народнага і асабістага светаўспрыняцця і філасофіі ў кантэксце сучаснасці.

Выкарыстанне ў сучасных творах старажытных відаў і формаў пляцення яшчэ раз падкрэслівае непарыўную сувязь традыцый у мастацтве саломапляцення.

Кожны твор мастацтва мае сваю ўласную логіку ўнутранай структуры і сэнсу. У прафесійным мастацтве на першы план выходзіць кампазіцыйны, формаўтваральны прынцып і ад яго ідзе развіццё сэнсу твора, сам твор пры гэтым набывае характар абстрактнай сістэмы знакаў: знакі не маюць дакладных значэнняў і магчымы любыя варыянты іх спалучэння, тады трактоўка сімволікі твора і яго знакаў становіцца непрадказальнай. У творах народнага мастацтва форма залежыць ад зместу, кампазіцыю знакаў і сімвалаў утварае семантыка.

Што тычыцца мастацтва сярэдзіны XX-пачатку XXI стагоддзя, калі ў свядомасці мастакоў ні хрысціянства, ні традыцыйна народныя ўяўленні не займаюць месца бясспрэчнай дамінанты, сэнсы сімвалаў, а таксама формы знакаў ўзнаўляюцца мастакамі з літаратурных крыніц і развіваюцца па агульных законах мастацтва.

На сучастным этапе развіцця грамацтва і культуры, калі страчваюцца аўтэнтычныя формы існавання народнага мастацтва і глеба развіцця народнай творчасці, трэба асэнсаваць неабходнасць захавання і вывучэння мастацкай спадчыныя, якая складае аснову народнага мастацтва і па сеняшні дзень ўзбагачае беларускую нацыянальную культуру і з'яўляецца невычэрпнай крыніцай для пашырэння і развіцця галіны народнага і прафесійнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. "Таму што менавіта народнае мастацтва найбольш яскрава ўвасабляе тое адметнае, што робіць культуру кожнага этнасу распазнавальнай у суквецці культур іншых народаў"[1,с.7].

На сучасным этапе развіцця мастацтва саломапляцення Беларусі адбываецца значнае пашырэнне дэкаратыўна-пластычных магчымасцяў матэрыяла, а таксама тэматыкі саламяных вырабаў, часам велімі далёкай ад традыцыйных, адзначаецца неаднароднасць саламянай пластыкі: ад невялікіх вырабаў да станкавых, выставачных твораў, у якіх традыцыі цесна звязаны з навацыямі і ў тэмах і ў тэхніках. Майстры аб'ядноўваюць народныя традыцыі і прафесійнае мастацтва з яго прыёмамі і формамі.

Такім чынам, сучаснае мастацтва саломапляцення вызначаецца:

- Традыцыяналізмам у сэнсе звароту да духоўнай спадчыны мінулага.
- Выкарыстаннем традыцыйнай сімволікі, пры чым можна асобна вылучыць старажытную дахрысціянскую сімволіку, уласна хрысціянскую, а таксама сімволіку культурных традыцый іншых народаў свету.
- Стварэннем новых тэхнік і тэхнічных прыёмаў.
- Новай роляй і новымі функцыямі саламяных вырабаў у духоўнай і матэрыяльнай культуры Беларусі.

Пры свядомым ужыванні старажытнай сімволікі сучасныя мастакі кіруюцца ў асноўным літаратурнымі крыніцамі, што вымагае вывучэнне дадатковай колькасці памежных дысцыплін: этнаграфіі, міфалогіі, гісторыі, тэалогіі, фальклору, як уласна беларускіх, так і сусветных і, у сваю чаргу, спрыяе прыходу ў мастацтва сімвалаў іншых культур.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Сімволіка мастацтва саломапляцення уяўляе сабою складаную дынамічную сістэму, якая ў сваім развіцці кіруецца як агульнымі (традыцыйнымі), так і ўласнымі (аўтарскімі) правіламі стварэння вобразаў, сімвалаў і знакаў. Семантыка сімвалаў мае шырокае кола крыніц, ад традыцыйных нацыянальных да сусветных. Прынцыпы формаўтварэння маюць сваей асновай традыцыйную пластыку саламяных вырабаў разам з сучаснымі мастацкімі і дызайнерскімі канцэпцыямі. У прафесійным мастацтве на першы план выходзіць кампазіцыйны, формаўтваральны прынцып ад якога ідзе развіццё сэнсу твора. У творах народнага мастацтва форма залежыць ад зместу, кампазіцыю знакаў і сімвалаў утварае семантыка, сімволіка пачынаецца з сэнсу (для чаго). Дэміфалагізацыя сімволікі, а таксама страта сэнсаў сімвалаў і знакаў абумоўлена гістарычным развіццём грамацтва і іншымі светапогляднымі арыенцірамі сучасных мастакоў.[1,2,3]

У сваім развіцці мастацтва саломапляцення прайшло шлях ад старажытнай магічнасці і ўключанасці ў пэўную абраднасць да адасобленай, эстэтычнай, мастацкай ролі саламяных вырабаў у наш час, што адбіваецца на іх тэматыцы і прынцыпах формаўтварэння. Пашыраецца дыяпазон тэм, сімволіка твора складаецца як вынік узаемадзеяння асобы мастака з нацыянальнай і сусветнай мастацкай спадчынай. У другой палове XX стагоддзя калі ні хрысціянства, ні язычніцтва як рэлігійныя традыцыі не мелі дамінуючай ролі ў духоўным жыцці грамадства, шэраг вобразаў і сімвалаў сфарміраваных ў іх семантычнай прасторы, знайшлі сваё ўвасабленне ў сучасным саломапляценні. Спалучэнне традыцый з новымі знаходкамі дазволіла саломопляценню развівацца як самастойнаму жанру дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ